**Лысак К.Ф.**

# ЭТАПЫ ЭВАЛЮЦЫІ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАІДЭНТЫФІКАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ

Беларускі этнас склаўся напрыканцы XVIII - пачатку XIX стагоддзя і здолеў захаваць у сябе шмат непаўторных рыс. Штуршком для вывучэння самабытнасці беларускага народа "з боку" стаў падзел Рэчы Паспалітай і уключэнне беларускіх земляў у склад Расейскай Імперыіі. Шмат даследчыкаў выявілі цікавасць да асаблівасцяў культуры і быту жыхароў набытых абласцёў. З другога боку, уздым рамантызму таксама зрабіў свой уклад у асэнсаванні беларусаў як носьбітаў уласнай культуры і ў прызнанне яе самабытнасці. Ад гэтага часу пачынаецца назапашванне ведаў, якія ў наступным розныя дзеячы культуры, палітыкі і іншых сфер жыцця выкарыстоўвалі з мэтай напаўнення сацыяльна-культурнай прасторы беларусаў. Трэба адзначыць, што у розныя часы стварэнне гэтай прасторы пераследвала розныя мэты: адукацыя, навука, мастацтва, абаснаванне мэтазгоднасці грамадскага і палітычнага руху і, ў рэшце, стварэнне дзяржаўнасці. Такім чынам, мэты уключэння беларускага насельніцтва у сацыяльна-культурную прастору можна вызначыць як парадыгмы, якія змяняць адна адну на працягу часу і вызначаюць характар гэтай прасторы. Дзякуючы гэтаму намі была створана перыядызацыя этапаў эвалюцыі сацыяльна-культурных тэхналогій фарміравання нацыянальнай самаідэнтыфікацыі ў Беларусі, пачынаючы ад падзелу Рэчы Паспалітай і да нашых дзён, і ахарактарызаваны рысы кожнага.

Галоўны прынцып, які пакладзены ў перыядызацыю адрэзка часу, які даследуецца, - гэта вылучэнне беларусаў як асобнай групы насельніцтва пад-час уцягвання іх у сацыяльна-культурную дзейнасць. Другім чыннікам пры стварэнні дадзенай аўтарскай перыядызацыі з'яўляецца ўзаемадносіны саміх беларусаў з навакольным светам.

1. Дзейнасць уніятаў-базыліянцаў (канец XVIII ст. - Пачатак XIX ст.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Станаўленне навуковага беларусазнаўства (Пачатак XIX ст. - 1846)

3. Нараджэнне нацыянальнай беларускай літаруры (1846-1863)

4. Станаўленне грамадзянскага і палітычнага руху, развіццё літаратуры (1863-1906).

5. Нашаніўскі” перыяд (1906-1920)

6. Станаўленне дзяржаўнасці (1919-1941)

7. Савецкі перыяд (1941-1985)

8. Перабудова, нацыянальнае Адраджэнне, набыццё незалежнасці (1985-1991)

9.Сучаснасць (ад 1991 да нашых дзён).

Разгледзем кожны этап дадзенай перыядызацыі больш падрабязна.

1. Дзейнасць уніятаў-базыліянцаў (канец XVIII ст. - Пачатак XIX ст.) у першую чаргу прадстаўлена выдавецкай дзейнасцю. Менавіта яны адны з першых яшчэ у XVIII ст. пачалі выдаваць прадукцыю арыентаваную на сялян, на роднай для іх беларускай мове. Цэнтрам уніяцкага выдавецтва была друкарня ў мястэчку Супрасль, недалёка ад Беластока. Друкарня знаходзілася ў праваслаўным манастыры. На працягу XVI ст. ён з’яўляўся цэнтрам праваслаўнай асветы. Асноўнае друкарскае абсталяванне — друкарскі прэс і кірылічны шрыфт. У друкарні неаднаразова перадрукоўваліся такія творы, як Служэбнік, Псалтыр, Святцы, Часаслоў і інш. кнігі рэлігійнага зместу.

2. Станаўленне навуковага беларусазнаўства (Пачатак XIX ст. - 1846).

Ад пачатку XIX стагоддзя, пасля уваход беларускіх земляў у склад Ресейскай Імперыіі, паўстала неабходнасцьу навуковым вывучэнніновадалучаных земляў. Дзякуючы працы шэрга даследчыкаў, пачалося назапашванне фальклорнага, этнаграфічнага і моўнага матэрыялу. Аднім з першых і самых ўплывовых даследчыкаў быў мовазнавец-лексікограф, фальклярыст і этнограф Іван Іванавіч Насовіч - прадстаўнік ідэйна-палітычнага руху заходнерусізму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З іншага боку, адчыніў свае дзверы Віленскі універсітэт, які стаў калыскай ідэй неабходнасці беларускай і літоўскай аўтаноміі. Ганаровым папячыцелям і патронам універсітэту становіцца князь Адам Чартарыйскі. Некаторы час, да паўстання 1830—1831 гг., універсітэт зазнае час росквіту. Вучыліся тут Адам Міцкевіч, Юліуш Славацкі. Колькасць студэнтаў узрасла ад 290 у 1804 да 1321 у 1830. У 1823 годзе вучэльня стала найбуйнейшай у Расіі і Еўропе, пераважаючы па колькасці студэнтаў Оксфардскі ўніверсітэт".

3. Нараджэнне нацыянальнай беларускай літаруры (1846-1863)

Асноўнае адрозненне зараджэння беларускай нацыянальнай ідэі ў пачатку і сярэдзіне XIX стагоддзя ад іншых - гэта адсутнасць ідэі беларускай дзяржаўнасці і супрацьпастаўлення яе ідэі польскай дзяржавы. Першае пакаленне беларускай інтэлігенцыі (напрыклад, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч) былі прыхільнікамі ідэі польскага федэралізму. Такая прапольская арыентацыя не спрыяла заахвочванню прасоўвання беларускай культуры ў Расійскай імперыі, што выяўлялася ў адсутнасці беларускіх школ, выданняў на беларускай мове. Станаўленне грамадзянскага і палітычнага руху, развіццё літаратуры (1863-1906).

У розумах мясцовай інтэлігенцыі змагаліся польскае самасвядомасць і ідэалогія так званага «заходне-русізму», згодна з якой беларусы былі толькі адной з этнаграфічных груп рускага народа. Ідэя самастойнасці беларускага народа была ўпершыню вылучана, мабыць, народніцкага групай «Гоман», якая дзейнічала сярод беларускіх студэнтаў у Пецярбургу ў 1880-я гг.,

4. Нашаніўскі" перыяд (1906-1920)

У лістападзе 1906 г. БСГ пачала выдаваць новую легальную газету на беларускай мове «Наша ніва». Асноўным аб'ектам дзейнасці БСГ было беларускае сялянства. Яе ўплыў на гарадскіх рабочых, за выключэннем Мінска і Вільні, быў нязначны. Ва ўмовах наступу рэакцыі нелегальная дзейнасць грамады спынена. З 2-й паловы 1907 г. лідэры БСГ засяроддзілі сваю дзейнасць на выданні газеты «Наша ніва», якая стала ідэолагам і арганізатарам беларускага нацыянальна-культурнага руху, разгарнула на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сваіх старонках прапаганду нацыянальнай свядомасці, ідэі нацыянальна-культурнага адзінства беларусаў, дамагалася прызнання самастоцнасці беларускай нацыі, змагалася за ўвядзенне беларускай мовы ў школе, царкве і касцёле.

5. Станаўленне дзяржаўнасці (1919-1941)

Верагодна, спроба стварэння беларусамі сваёй нацыянальнай дзяржавы (БНР) пасля развалу Расійскай імперыі, была найменш ўдалай ў паўночна-ўсходнем эўрапейскім рэгіёне. Беларуская дзяржава атрымлівае права на існаванне толькі ў рамках Савецкага Саюза. Пасля захопу Вільні Чырвонай арміяй у 1939 годзе і далучэння яго да Літвы, а не да БССР, беларускае дзяржава губляе права называцца пераемніцай Вялікага княства Літоўскага, што негатыўна адбіваецца на нацыянальнай ідэі. У часы Савецкага Саюза ні ў якой іншай рэспубліцы так эфектыўна не праводзілася саветызацыя і руссіфікація, як у БССР. У часы Перабудовы нацыянальны рух у Беларусі не быў настолькі шырокі, як у Літве альбо Украіне. У канчатковым выніку, усе гэтыя фактары аформілі сучасны вектар дзяржаўнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

6. Савецкі перыяд (1941-1985)

7. Перабудова, нацыянальнае Адраджэнне, набыццё незалежнасці (1985-1991)

Паўнавартасны маладзёвы нефармальны рух бярэ свой пачатак ў 1979 годзе, пачынаючы так званай “Беларускай спеўна-драматычнай майстроўні” ці проста “Майстроўні.” Суполка была ўтворна студэнтамі філалагічнага факультэту Беларускага дзяржаўнага ўніверсытэту і Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Прымалі, таксама, ўдзел вучні Рэспубліканскай школы інтэрнату па музыцы і выяўленьчаму мастацтву, вучні мінскіх школаў, працоўная моладзь. У пачатку сваёй дзейнасці суполка налічвала дзесатак удзельнікаў, а ужо напрыканцы свайго існавання - больш за сто чалавек. Як галоўную мэту майстроўцы ставілі вывучэнні і папулярызацую народнай беларускай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Белорусы: становление этноса и «национальная идея» // Персональный сайт белорусского историка Вячеслава Носевича [Электронный ресурс].– 2011. – Режим доступа : http://www.vln.by/node/42. – Дата доступа : 14.11.2011.

2. Ліндэр, Р. Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс гістарычная палітыка ў Беларусі XIX-XX ст / Р. Ліндэр. – СПб. : Неўскі прасцяг, 2005. – 540 с.

3. Лыч, Л. Культура Беларуси / Л. Лыч. – Мн. : Кнігазбор, 2010. – 56 с.

4. Марозава, С. З гісторыі ўніяцтва ў Беларусі (да 400-годдзя Брэсцкай уніі) / С. Марозава, Т. Казакова, Ю. Бохан і інш. – Мн. : НКФ "Экаперспектыва", 1996. – 134 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ